# 30 КАСТРЫЧНІКА—ІІІ-я СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ. ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ ЯЕ ДЭЛЕГАТАМ!

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 31 (164) | Субота, 27 кастрычніка 1973 г. | Газета выходзіць з верасня 1969 года раз у тыдзень | Цана 2 кап.

**ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКІМ ВУЧЭННЕМ, ДАСЯГНЕННЯМІ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І КУЛЬТУРЫ! БУДЗЬЦЕ АКТЫЎНЫМІ БАРАЦЬБІТАМІ ЗА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ РАШЭННЯЎ XXIV З'ЕЗДА КПСС!**

**НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ — ПЕРАДАВЫ АТРАД МАЛАДЫХ БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМУ!**

(З Заклікаў ЦК КПСС да 56-й гадавіны Вялікага Кастрычніка).



**У камсамольскай арганізацыі ўніверсітэта нямала выдатнікаў вучобы, сапраўдных актывістаў грамадскага жыцця. Лепшым з лепшых аказваецца высокае давер'е: іх выбіраюць камсамольскімі і прафсаюзнымі важакамі груп, курсаў, факультэтаў, старастамі, надзяляюць іншымі адказнымі паўнамоцтвамі.**

**На гэтым здымку вы бачыце студэнтку чацвёртага курса біёлага-глебавага факультэта Раісу Патапаву і чацвёртакурсніка фізічнага факультэта Сяргея Вярцячых. Яны — гордасць камсамольскай арганізацыі ўніверсітэта. Раіса — дэпутат абласнога савета дэпутатаў працоўных, узначальвае камсамольскае бюро факультэта. Камсамольскім важаком з'яўляецца і выдатнік вучобы Сяргей Вярцячых.**

Фота А. Рудчанкі.

# ВАЖКІ ПРАЦОЎНЫ ЎКЛАД

СЁЛЕТНЯЙ восенню нашы студэнты па традыцыі аказвалі дапамогу сельскім працаўнікам на ўборцы ўраджаю. Больш за месяц 2105 юнакоў і дзяўчат пад кіраўніцтвам 80 выкладчыкаў знаходзіліся ў калгасах і саўгасах вобласці. Іх сіламі з 1675 гектараў убрана 23435 тон бульбы, а таксама выканан вялікі аб'ём іншых сельскагаспадарчых работ

У вольны час студэнты і выкладчыкі ГДУ выступалі перад насельніцтвам з лекцыямі і дакладамі, арганізоўвалі спартыўныя мерапрыемствы, вечары сустрэч з моладдзю і ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, са знатнымі людзьмі вёскі. У агульнай колькасці па рознай тэматыцы прачытана лекцый і праведзена гутарак — 31, арганізавана вечароў адпачынку і паказана канцэртаў мастацкай самадзейнасці — 28, наладжана спартыўных сустрэч студэнтаў і сельскай моладзі — 47 За гэтымі лічбамі — значная ідэйна-палітычная і культурна-масавая работа, якая была праведзена пасланцамі ўніверсітэта на месцах іх размяшчэння.

Студэнты аказалі дапамогу сельскім школам у абсталяванні кабінетаў і спартыўных пляцовак, шэфствавалі над састарэлымі калгаснікамі, рабочымі саўгасаў, інвалідамі Вялікай Айчыннай вайны: убіралі ім гароднія культуры, нарыхтоўвалі сена для дамашняй жывёлы, дровы, рамантавалі жыллё. А ў калгасе «Зара камунізму» Петрыкаўскага раёна 6 студэнтаў і выкладчыца Л. А. Цурганава адразу ж адклікнуліся на дапамогу — далі сваю кроў для выратавання жыцця пацярпеўшай ад нясчаснага выпадку калгасніцы.

За ўзорную працу на ўборцы ўраджаю і за актыўны ўдзел у грамадскім жыцці калгасаў і саўгасаў многія выкладчыкі і студэнты нашага ўніверсітэта былі заахвочаны. У прыватнасці, 112 чалавек узнагароджаны граматамі, 68 — прэміраваны. Шмат каму аб'яўлена падзяка.

Самымі высокімі паказчыкамі ў працы парадавалі групы Ф-11, Ф-12, Ф-13, Ф-21 фізічнага факультэта на чале з Г. І. Варатніцкім, В. М. Сабаленкам, М. Т. Даніленкам, М. М. Плаксіным, якія працавалі ў саўгасах «Акцябрскі», «Парэчча», «Заазер'е» Акцябрскага раёна. Вызначыліся таксама групы Т-22, Т-23, 0-42 эканамічнага факультэта, якія пад кіраўніцтвам выкладчыкаў П. П. Саковіча, А. І. Окрут, В. М. Навуменкі працавалі на бульбяных палетках у калгасах «Прагрэс» і імя Калініна Светлагорскага і ў саўгасе «Побалава» Рагачоўскага раёнаў. Гэтыя групы ўзнагароджаны ганаровымі граматамі гаспадарак.

У саўгасе «Навасёлкі» Петрыкаўскага раёна працавалі студэнты механіка-матэматычнага факультэта. Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў І. І. Старуна, Т. Е. Нуждовай, В. Д. Сахарнікавай яны разгарнулі паміж сабой на ўборцы ўраджаю дзейснае сацыялістычнае спаборніцтва і дабіваліся высокай выпрацоўкі. Большасць студэнтаў выконвала дзённыя нормы на 110—120 працэнтаў.

Плённа папрацавалі групы М-15, М-13 і М-12. У сацыялістычным спаборніцтве яны заваявалі першыя тры месцы і ўдастоіліся прэмій — адпаведна 40,35 і 25 рублёў.

Групы студэнтаў, якія вызначыліся на ўборцы ўраджаю, сталі вядомымі ўсяму ўніверсітэцкаму калектыву. Іх стараннасць служыць добрым прыкладам для ўсіх. І вельмі прыемна, што юнакі і дзяўчаты з гонарам трымаюць слова, дадзенае сёлетняй зімой на Усесаюзным камсамольскім сходзе, які праходзіў пад дэвізам: «Выдатнай вучобай і ўдарнай працай азнамянуем трэці, рашаючы год дзевятай пяцігодкі!»

**Д. ЛЯВОНЧАНКА,**
**прарэктар па вучэбнай рабоце, старшыня камісіі па арганізацыі ўборкі ўраджаю.**

*Да Дня нараджэння камсамола*

# ЗАЎЖДЫ Ў АВАНГАРДЗЕ

29 кастрычніка Усесаюзнаму Камуністычнаму Саюзу Моладзі спаўняецца 55 гадоў.

Шлях, пройдзены камсамолам, паказвае, што галоўная крыніца велізарнай, усё ўзрастаючай сілы ВЛКСМ — у паўсядзённым кіраўніцтве ім Камуністычнай партыяй. Яна клапатліва і ўмела накіроўвае ўсю яго дзейнасць. «У маім партыйным білеце ляжыць яго маленькі сынок — членскі білет Ленінскага камсамола». Гэта словы Мікалая Астроўскага. У іх усё: і любоў да свайго палымянага камсамольскага юнацтва, і павага да партыі, якая адкрыла перад маладым пакаленнем новыя магчымасці, навучыла быць стойкімі барацьбітамі рэвалюцыі.

Жыццё па Ленінскіх запаветах, быць заўсёды і ва ўсім вернымі сынамі партыі і народа, як Ленін, да канца, да апошняга дыхання аддаваць сябе справе рэвалюцыі — у гэтым мэта і сэнс жыцця маладога пакалення Краіны Саветаў.

Камсамольцы заўсёды на пярэдняй лініі. ВЛКСМ вядзе і згуртоўвае моладзь, ён быў запявалам на будоўлях першых пяці годак, на асваенні цалінных зямель. Ратнымі подзвігамі праславіў сябе камсамол у гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. На сцягу Ленінскага камсамола — шэсць ордэнаў. Гэта —прызнанне яго вялікіх заслуг перад партыяй, народам, Радзімай.

За ўсю гісторыю існавання ВЛКСМ больш ста мільёнаў чалавек прайшлі ў яго радах першую школу ідэйнай загартоўкі. Тут атрымалі ўрокі мужнасці тыя, што разам з бальшавікамі ішлі на штурм старога свету, абаранялі заваёвы Кастрычніка ў полымі грамадзянскай вайны, а потым пад кіраўніцтвам партыі змагаліся з голадам і разрухай, аднаўлялі народную гаспадарку. Бессмяротная слава выхаванцаў камсамола —герояў Вялікай Айчыннай вайны, якія грудзьмі засланялі Айчыну ў час небяспекі.

І сёння Ленінскі камсамол працягвае летапіс сваіх слаўных спраў. Пры актыўным удзеле камсамольцаў уведзены ў строй новыя гіганты энергетыкі, доменныя і мартэнаўскія печы, пракатныя станы, пракладзены тысячы кіламетраў нафтавых і газавых магістраляў, чыгунак і г. д. Па-ўдарнаму працуе моладзь і ў сельскай гаспадарцы.

Многія сотні тысяч юнакоў і дзяўчат удзельнічаюць у сацыялістычным спаборніцтве. Іх лозунг: «Пяцігодцы —ударную працу, майстэрства і пошук маладых!».

Праяўленнем высокай грамадскай актыўнасці моладзі сталі студэнцкія будаўнічыя атрады. Аб значнасці ўкладу СБА ў камуністычнае будаўніцтва сведчыць той факт, што ў рашаючым годзе дзевятай пяцігодкі іх сіламі па краіне будзе выканана работ на мільярд рублёў капіталаўкладанняў.

Прымаючы святое імя У. І. Леніна, VI з'езд камсамола пісаў у сваім маніфесце: «Не для краснага слоўца, не з жадання насіць лепшае з усіх імёнаў, не толькі для таго, каб ушаноўваць павагай памяць вялікага памёршага, прынялі мы гэта рашэнне. Не, мы прынялі яго для таго, каб уся працоўная моладзь усіх народаў, насяляючых СССР, разам са сваім перадавым атрадам — Камуністычным Саюзам Моладзі прасякнулася адзінай воляй і цвёрдай рашучасцю навучыцца па-ленінску жыць, працаваць і змагацца, ажыццяўляць запаветы, пакінутыя нам Леніным...»

Ленінскі камсамол верны гэтай клятве.

**Я. ЛЯЛЬКОВА,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола.**

# У ПАРТКОМЕ

**Пазаўчора адбылося чарговае пасяджэнне парткома. Разгледжана пытанне аб наборы ў аспірантуру. З інфармацыяй выступіла загадчыца аспірантуры ўніверсітэта А. Г. Анічэнка.**

**Партком абмеркаваў таксама пытанне аб падрыхтоўцы і святкаванні 56-ай гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.**



Цікава праходзіць практыка ў студэнтаў біёлага-глебавага факультэта. Асабліва тады, калі яна звязана з вывучэннем роднага краю, яго прыродных багаццяў. Як правіла, практыканты прывозяць з сабой шмат матэрыялаў.

На здымку: ля стэнда па ахове флоры і фаўны беларускага Палесся. Яго зрабілі студэнты пасля праходжання па гэтай тэме вучэбнай практыкі.

Фота А. Рудчанкі.

*Студэнцкія мерыдыяны*

**З кожным годам умацоўваюцца сувязі паміж студэнтамі нашага і Ягелонскага універсітэта Польскай Народнай Рэспублікі. Стаў традыцыйным абмен дэлегацыямі. Вось і сёлета група польскіх студэнтаў наведала Гомельшчыну, з цікавасцю азнаёмілася з расквітнеўшым краем беларускага Палесся. У сваю чаргу выхаванцы гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ на чале з загадчыкам кафедры рускай і беларускай моў прафесарам У. В. Анічэнкам выязджала да сваіх сяброў у Польшчу.**

**Гэта падарожжа зрабіла на ўдзельнікаў зарубежнай практыкі вялікае ўражанне. Яно знайшло ў пэўнай ступені адлюстраванне ў пуцявых нататках студэнткі чацвёртага курса філфака Наташы Цясленка.**

# НЕЗАБЫЎНЫЯ СУСТРЭЧЫ

...Гродна. Гэты пагранічны горад быў для нас апошнім на роднай зямлі. Перад намі цяпер ляжала Польшча. І вось ўжо прыхінуўшыся да вагоннага шкла мы з нейкім сумам праводзілі вачыма пагранічныя слупы. Нас ахоплівала двайное пачуццё: пачуццё гэтага самага суму і незвычайнае пачуццё зацікаўленасці. Якая ж яна, Польшча? Што за людзі тут жывуць?

Самі разумееце: лепш раз убачыць, чым сто разоў пачуць. Неўзабаве мы прыбылі ў сталіцу братняй краіны — Варшаву. Начная Варшава была асабліва прыгожай ў мільгаючым моры агнёў. Але нас чакаў Кракаў, і на світанні мы былі ўжо ў гэтым вельмі старажытным горадзе.

### КРАКАЎ

Гэта — горад выдатных лягенд і паданняў. Гэта — сапраўдная гісторыя ў каменнях. Ідзеш па сучаснаму Кракаву, а гэткае пачуццё, быццам ты ў сярэдневяковым горадзе. Гэта асабліва адчувальна, калі крочыць ноччу па вузкіх вуліцах пры цьмяным святле рэдкіх фанароў і калі бачыш пагружаныя ў змрок касцёлы, якія толькі слаба асвятляюцца свечкамі, што стаяць у нішах касцёлаў за чырвоным шклом перад распяццем Хрыста. Штосьці крывавае, змрочнае, сярэдневяковае адчуваецца ва ўсім гэтым, як быццам зусім побач адчуваеш дыханне старажытнага мінулага.

Толькі дзякуючы намаганням савецкіх разведчыкаў Кракаў не быў узарваны па плану фашысцкага галоўнага камандавання. Скрозь сівізну вякоў ён данёс да нас старажытную нямеркнучую праз вякі прыгажосць.

На тым месцы, дзе ўзнік Кракаў, цякла Вісла. Гэта была важная ў старажытнасці рака для вядзення гандлю. Шлях па ёй працягнуўся з поўначы на поўдзень. Назва гэтага старажытнага горада пайшла, як апавядае лягенда, ад імя першага князя Крака. Горад будаваўся на ўзгорках. У XIII стагоддзі ён стаў сталіцай Польшчы і быў ёй да XVI стагоддзя.

Кракаў асабліва не змяняецца. Не выпадкова ён прызнаны ў свеце як горад-музей. Тут быў пабудаваны і першы ўніверсітэт. Гэты горад па праву ганарыцца многімі сваімі выхадцамі. У сценах Ягелонскага ўніверсітэта публічна прагучала тэорыя Мікалая Каперніка аб зусім новай, працілеглай рэлігійным догмам будове сонечнай сістэмы. Тут ён свабодна змог выступіць са сваім адкрыццём.

Польская зямля ўшаноўвае памяць аб вялікім астраноме, філосафу, урачу Мікалаю Каперніку. У Польшчы, а таксама ва ўсім свеце, сёлета шырока адзначаецца пяцьсотгоддзе з дня яго нараджэння.

З XVI стагоддзя пачынаецца ўпадак Кракава. Калі ў той час ён налічваў сто тысяч жыхароў, дык ужо ў семнаццатым стагоддзі ў дзесяць разоў менш. Многія людзі хацелі ўзняць Кракаў на былую вышыню, аб'яднаць раздробленую Польшчу ў адно цэлае. У 1794 годзе на галоўнай рынацчнай плошчы ў Кракаве Тадэуш Касцюшка даваў прысягу польскаму народу аб'яднаць пакутлівую, разарваную на кавалкі радзіму.

У Кракаве шмат помнікаў. Сярод іх і помнік вялікаму польскаму паэту, песняру зямлі польскай Адаму Міцкевічу, упамінаемаму ўжо Мікалаю Каперніку, польскім і савецкім воінам, якія аддалі жыццё за свабоду і незалежнасць Польшчы.

Сапраўды непаўторныя па сваёй прыгажосці Кракаўскія Плянты з асвяжаючымі фантанамі і мнагалікімі скульптурамі, якія адлюстроўваюць сцэны з твораў Адама Міцкевіча. У зялёным акаймленні Плянтаў узвышаюцца вострыя зубцы крапасной сцяны Барбакана. Тут позна вечарам выступаюць самадзейныя польскія ансамблі. Мы паглядзелі ў іх выкананні кабарэт «Лунный кавалер». Неяк інакш уяўляеш усё тое, што адбываецца на сцэне, калі сядзіш унутры замка з мноствам вежаў на сцяне; пад адкрытым небам і пры святле адных факелаў, якія гараць уздоўж сцяны замка, было незвычайна цікава глядзець спектакль.

Блізка пазнаёміў нас з Польшчай Этнаграфічны музей. Шмат уражанняў засталося і ад наведвання Народнага музея. Але самае незабыўнае для нас — гэта азнаямленне з музеем У. І. Леніна. Тут мы дакументальна пазнаёміліся з многімі яркімі старонкамі жыцця правадыра працоўных усяго свету, стваральніка першай Савецкай дзяржавы. Цікава, што Уладзімір Ільіч выступаў з лекцыяй па нацыянальнаму пытанню і перад студэнтамі Ягелонскага ўніверсітэта. Мы пранікліся пачуццём вялікай гордасці, што ўсё, звязанае з імем нашага любімага правадыра і настаўніка, свята захоўваецца ў Польшчы. І якое шчасце быць грамадзянінам нашай цудоўнай Радзімы, якая дала свету Леніна. Вельмі прыемна было чуць цёплыя словы пра самага дарагога для нас чалавека.

У гэтым жа музеі мы пазнаёміліся таксама з выстаўкай, якая расказвае пра жыццё і дзейнасць вернага паплечніка Леніна — Ф. Э. Дзяржынскага.

**Н. ЦЯСЛЕНКА,**
**студэнтка IV курса.**

**(Працяг будзе).**

**СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ НАРОДНЫХ КАНТРАЛЁРАЎ**

# У ДАЗОРЫ БЫЦЬ ПІЛЬНЫМІ

Як мы паведамлялі ў папярэднім нумары газеты, на агульным сходзе супрацоўнікаў універсітэта заслухана справаздача і праведзены выбары галаўной групы народнага кантролю. Са справаздачным дакладам выступіў яе старшыня прафесар Г. П. Мялёхін.

За мінулыя два гады работы, адзначыў дакладчык, адбылося 8 пасяджэнняў галаўной групы. На іх запрашаліся старшыні груп факультэтаў і АГЧ, з удзелам якіх абмяркоўваліся самыя разнастайныя пытанні.

На адным з пасяджэнняў сур'ёзная, прынцыповая размова ішла аб выкарыстанні абсталявання і апаратуры на кафедрах універсітэта. Гэта пытанне падрыхтаваў сектар вучэбнай работы. Правяраючыя таварышы паведамілі, што ва ўніверсітэце на 1 лютага мінулага года налічвалася на 271856 рублёў каштоўнага абсталявання, з якога на 59575 рублёў не выкарыстоўвалася і на 27592 рублі было няспраўным і недаўкамплектаваным.

Пасля абмеркавання на пасяджэнні галаўной групы пытанне аб рацыянальным выкарыстанні абсталявання вынеслі на разгляд Вучонага савета ўніверсітэта. У выніку частка невыкарыстоўваемай апаратуры і прыбораў была перададзена іншым вну, школам і арганізацыям вобласці. З асобных кафедр невыкарыстоўваемае абсталяванне перадалі тым кафедрам, якія мелі ў ім патрэбу.

Сектар вучэбнай работы праверыў таксама, як размяркоўваецца вучэбная нагрузка на ўсіх кафедрах універсітэта. Было ўстаноўлена, што на 19 студзеня 1973 года на 30 кафедрах універсітэта мелася 39 вакантных пасад прафесарска-выкладчыцкага саставу і было не размеркавана 42788 вучэбных гадзін. У выніку частка выкладчыкаў мела нагрузку звыш устаноўленых норм. Акрамя таго, на асобных кафедрах асістэнтам без вучоных ступеняў davalі чытанне лекцый у аб'ёме ад 80 да 190 гадзін, што не дазваляецца. У ходзе праверкі было выяўлена таксама нездавальняючае вядзенне экранаў бягучай паспяховасці на факультэтах фізвыхавання, біёлага-глебавым, механіка-матэматычным і фізічным. Для прадухілення ўсіх гэтых недахопаў прыняты неабходныя меры.

Галаўная група двойчы абмяркоўвала пытанне аб стане навукова-даследчай работы па гаспадарча-дагаворных тэмах. Адзначана, што не ўсе справаздачы аб выкананай рабоце заслухоўваліся на пасяджэннях кафедр і Вучоных саветаў факультэтаў. Па тэме № 2, якая выконвалася пад кіраўніцтвам прафесара А. Р. Кінзікеева, не атрымана патрэбных вынікаў, хаця затрацілі на гэта значныя сродкі. Сёлета па розных прычынах спынена выкананне работ па двух тэмах, якія вялі т.т. Фірсаў і Галееў. У выніку зрасходаваныя на гэтыя мэты сродкі не акупіліся.

Сектар навуковай работы правёў вялікую і патрэбную работу па праверцы выкарыстання лабаранцкага саставу на кафедрах універсітэта. Гэта пытанне спачатку разглядалася на пасяджэнні галаўной групы народнага кантролю, а потым партыйным камітэтам. У прынятым рашэнні адзначан шэраг недахопаў па размеркаванню штатаў лабарантаў на кафедрах, іх загружанасці работай, указана на значную цякучасць кадраў і інш. Адпаведныя рэкамендацыі па гэтаму пытанню былі перададзены рэктарату і парткому.

Сектар быту ажыццяўляў пастаянны кантроль за работай універсітэцкай сталовай і буфетаў. Аднак мы не здолелі дабіцца таго, каб абслугоўванне ў іх адпавядала патрабаванням часу. Нядаўна па гэтаму пытанню галаўная група народнага кантролю звярнулася са спецыяльным пісьмом у трэст сталовых.

Народныя кантралёры трымалі таксама пад увагай стан аховы працы і тэхнікі бяспекі, сачылі за рацыянальным расходаваннем электраэнергіі ва ўніверсітэце, пастаянна цікавіліся работай аддзела матэрыяльнага забеспячэння АГЧ і іншых падраздзяленняў. Двойчы разглядалася пытанне аб правільнасці назначэння студэнтам стыпендый.

У працэсе работы галаўная група імкнулася падтрымліваць кантакты з групамі народных дазорных факультэтаў і АГЧ. Рэгулярна заслухоўваліся справаздачы старшынь груп, кантралявалася выкананне планаў іх работы. Высокай актыўнасцю ў сваёй дзейнасці вызначыліся групы народнага кантролю гісторыка-філалагічнага (старшыня А. І. Лашкевіч), геалагічнага (ст. С. Ф. Ажгірэй), механіка-матэматычнага (ст. У. Ф. Філіпцоў) факультэтаў.

Работа галаўной групы народнага кантролю прызнана здавальняючай. На сходзе выбран яе новы састаў.

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ!

Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый у лістападзе 1973 года.

### І. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

1. Партыя заклікае да новых здзяйсненняў («Заклікі ЦК КПСС да 56-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі»).

Гл. газету «Правда» за 14 кастрычніка 1973 года.

2. Міжнародны форум барацьбітоў за мір (да вынікаў работы Сусветнага кангрэса міралюбівых сіл у Маскве).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

### ІІ. ПЫТАННІ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

1. Твой вольны час.

Матэрыял публікуе часопіс «Политинформатор и агитатор».

2. Пачуццё патрыятызму.

Матэрыял публікуе газета «Знамя юности».

### ІІІ. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ

1. У інтарэсах умацавання міру і бяспекі народаў (да маючага адбыцца візіту Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева ў Індыю).

2. Справядлівая барацьба арабскіх народаў (да падзей на Блізкім Усходзе).

3. Беларуская ССР на міжнароднай арэне (да выбрання Беларускай ССР у састаў непастаянных членаў Савета Бяспекі).

Матэрыялы па гэтых тэмах публікуе газета «Звязда».

